лабараторна-палявы метад ацэнкі ўстойлівасці сартоў бульбы да фітафторы і авіяхім. метад барацьбы з ёю. З 1959 вядзе работу ў галіне імунітэту бульбы і памідораў да фітафторы. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

*Тв.*: Першая спроба фітапаталагічна-энтамалагічнага абследавання бульбы ў СССР з мэтай дзяржаўнага каранціну, Мн., 1932; Галаўнёвыя захворванні зерневых культур і меры барацьбы з імі, Мн., 1934; Бульба, Мн., 1947; Болезни картофеля, Мн., 1955; (разам з А. А. Сапаговай) Болезни томатов, Мн., 1963.

**ДАРОЖНЫ** Сяргей (сапр. Серада Сяргей Міхайлавіч; 25.2.1909, Слонім — 19.7.1943), беларускі савецкі паэт. Сын службоўца. У 1915—21 з бацькамі ў бежанстве (Варонеж). Выхоўваўся ў Мазырскім дзіцячым доме (1921—24). Вучыўся ў Мінскім пед. тэхнікуме, у БДУ. Працаваў на гуце ў Барысаве, у рэдакцыях рэсп. газет і часопісаў. Друкавацца пачаў у 1925. Член літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша». Выдаў зб. вершаў «Звон вясны» (1926, з І. Плаўнікам), «Васільковы россып» (1929), «Пракосы на памяць» (1932). Славіў гераічныя будні маладой краіны сацыялізма (вершы «Новы дом», «Суботнік», «На ўдарных франтах», «Грыміць мураваны бетон...»), пісаў пра рэвалюц. барацьбу працоўных Зах. Беларусі («Вольны ліст зняволенаму брату» і інш.). Пераклаў на бел. мову паасобныя творы Дз. Беднага, М. Кальцова, У. Караленкі, С. Кірсанава, А. Новікава-Прыбоя, І. Уткіна, раман Г. Караваевай «Лесазавод» (1932).

*Тв.*: Выбраныя вершы, Мн., 1966.

*Літ.*: Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 151—155; Наднёманскія былі, Мн., 1968, с. 39—41. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

**ДАРОЖНЫ БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ** Галоўнага ўпраўлення шашэйных дарог пры СМ БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і арганіз.-тэхн. пытанні будаўніцтва, рамонту і догляду аўтамаб. дарог і мастоў.

Засн. ў 1962 у Мінску. Аддзелы: дарожных канструкцый, тэхналогіі будаўніцтва, штучных збудаванняў, эканомікі, навук. арганізацыі працы, эксплуатацыі дарог. Дырэктар ін-та канд. тэхн. н. І. Я. Яўгеньеў (з 1965).

Асн. кірункі даследаванняў: выкарыстанне ў дарожным буд-ве мясцовых матэрыялаў і адходаў прамысловасці, буд-ва дарог у забалочанай мясцовасці, павышэнне транспартна-эксплуат. характарыстык дарог і мастоў, удасканаленне арг-цыі вытворчасці і павышэнне яе эканам. эфектыўнасці. Вынікі навук. даследаванняў: распрацавана тэхналогія ўмацавання цэментам дробназярністых пяскоў, прапанаваны метадалогія канструявання і разліку землянога палатна на тарфяных грунтах, метады павышэння грузападымальнасці мастоў без іх рэканструкцыі і інш. Выдадзены працы: «Будаўніцтва аўтамабільных дарог цераз балоты» І. Я. Яўгеньева (1968), «Эфектыўнасць выкарыстання вытворча-тэхнічнай і навуковай інфармацыі ў дарожнай гаспадарцы» Ю. Г. Кавалёва і Г. І. Шчарбіцкага (1968), «Дэфекты жалезабетонных аўтадарожных мастоў» В. В. Чаркасава (1969) і інш. З 1965 выдаюцца навук. зборнікі.

*І. Я. Яўгеньеў.* Мінск.

**ДАРОЖНЫЯ ВОЙСКІ**, спец. войскі для аднаўлення, рамонту, буд-ва і эксплуатацыі дарог, а таксама для дарожна-камендацкай службы. Складаюцца з асобных дарожна-будаўнічых, мостабудаўнічых і дарожна-камендацкіх часцей.

**ДАРОЖНЫЯ МАШЫНЫ**, агрэгаты і машыны для выканання комплексу работ па будаўніцтве, доглядзе і рамонце дарог. Шырока выкарыстоўваюцца ў гідратэхн., аэрадромным, прамысловым, гарадскім, с.-г. буд-ве і на інш. інж.-буд. работах.

Адрозніваюць Д. м. самаходныя, навясныя і прычапныя да трактароў і цягачоў. Паводле прызначэння падзяляюцца на групы для выканання пэўных відаў работ: падрыхтоўчых (індэкс машын ДП), земляных (ДЗ), для ўшчыльнення грунту і пакрыццяў (ДУ), для зімовага і летняга догляду і рамонту дарог, іх эксплуатацыі (ДЭ), для буд-ва і рэканструкцыі дарожных і аэрадромных пакрыццяў (ДС). ДП ачышчаюць дарожныя палосы ці буд. пляцоўкі ад хмызняку, верхняга расліннага слоя, разрыхляюць грунт (дрэвавалы, карчавальнікі, кустарэзы, тралёвачныя і карчавальныя лябёдкі, рыхліцелі); ДЗ капаюць і перамяшчаюць грунт (*экскаватары, грэйдэры, канавакапальнікі, стругі, бульдозеры, скрэперы*); ДУ ўжываюцца пры буд-ве насыпаў, ушчыльненні асноў пад пакрыцці дарог (самаходныя і прычапныя *каткі*, вібратары, трамбавальнікі); ДЭ рамантуюць дарогі, падмятаюць і паліваюць пакрыцці, ачышчаюць іх ад снегу, робяць падзяляльныя палосы, раскідаюць пясок пры галалёдзе (лёгкія аўтагрэйдэры і планіроўшчыкі, палівальныя і ўборачныя машыны, маркіравальнікі, снегаачышчальнікі, пескараскідальнікі і інш.); ДС рыхтуюць, кладуць і ўшчыльняюць асфальтавыя ці бетонныя сумесі (грунтазмешвальныя машыны, *гудранатары*, асфальтабетонамяшалкі, асфальтабетонаўкладчыкі, фрэзы дарожныя і інш.). На Беларусі работы па ўдасканаленні Д. м., стварэнні новых тыпаў, развіцці дарожнага машынабудавання вядуцца ў СКБ «Меліярмаш», Бел. політэхн. і Магілёўскім маш.-буд. ін-тах, на *мінскім заводзе «Ударнік»*, *Магілёўскім аўтамабільным заводзе*, Мазырскім з-дзе меліярац. машын. Гл. таксама *Будаўнічыя машыны*.

*Літ.*: Хархута Н. Я. и др. Дорожные машины, Л., 1968. *І. І. Леановіч.* Мінск.

**ДАРОЎСКІ** Мікалай Сцяпанавіч (1.5.1924, в. Стара-Рагавое Ніжнедзявіцкага пав. Варонежскай губ.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1943. Вызначыўся 24—25.6.1944 у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Кулямётная рота Д. фарсіравала Зах. Дзвіну і суткі адбівала контратакі ворага. Загінуў у рукапашным баі.

**ДАРОХІН** Іван Мікітавіч (31.3.1924—25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся 24—25.6.1944. У баі за нас. пункт Святое Возера Гомельскай вобл. агнём гарматы знішчыў самаходную ўстаноўку «фердынанд», 3 процітанкавыя гарматы, 2 мінамётныя батарэі, 3 кулямёты. Загінуў у баі.

**ДАРОШКА** Валянціна Іванаўна (н. 8.1.1927, в. Паставічы Старадарожскага р-на Слуцкай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1951). Прац. дзейнасць пачала ў 1945 у калгасе «Дружба» Старадарожскага р-на Мінскай вобл. У 1949—51 звеннявая па вырошчванні кок-сагызу, з 1951 палявод гэтага калгаса.

**ДАРТЫКОС ТАРАДА** (Dorticós Torrado) Асвальда (н. 17.4.1919, г. Сьенфуэгас), дзярж. і паліт. дзеяч Кубы. З сям'і ўрача. Д-р права